правоспособности, её участие в правовом и общественном процессе было минимизировано, что ограничило свободу совести в коллективном измерении. В результате, произошел перевод религиозной активности из общественной сферы в сферу частных интересов, локализация религии в приватной сфере.

**Библиографические ссылки**


1. Декрет Совета народных комиссаров РСФСР «Об отделении церкви от государства и школы от церкви» [Электронный ресурс] // Электронный ресурс правовой и нормативно-технической документации Режим доступа: http://docs.cntd.ru/document/9054838. Дата доступа: 22.09.2019.
2. Довгяло Н. В. Законодательные основы политики БССР в области религии в 1924–1939 годах // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. Новополоцк, 2012. № 1. С. 77–81.
3. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М: Политиздат, 1983. Т. 2. С. 606.
4. Постановление ВЦИК и СНК РСФСР от 8 апреля 1929 года «О религиозных объединениях» [Электронный ресурс] // Электронный ресурс правовой и нормативно-технической документации Режим доступа: http://docs.cntd.ru/document/9054838. Дата доступа: 22.09.2019.
5. Постановление VIII Всебелорусского Съезда Советов Рабочих, Крестьянских и Красноармейских Депутатов об утверждении Конституции Белорусской Социалистической Советской Республики от 11 апреля 1927 г. [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет портал «Pravo.by». Режим доступа: http://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi/kanstytutsyynae-prava-belarusi/kanstytutsyi-belarusi/konstitutsiya-1927-goda/. Дата доступа: 22.09.2019.
6. Постановление Чрезвычайного XII С`езда Советов Белорусской ССР Об утверждении Конституции (Основного Закона) Белорусской Советской Социалистической Республики от 19 февраля 1937 г. [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет портал «Pravo.by». Режим доступа: http://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi/kanstytutsyynae-prava-belarusi/kanstytutsyi-belarusi/konstitutsiya-1937-goda/. Дата доступа: 22.09.2019.
7. Робберс Г. Государство и религии в европейском праве / Под ред. М.А. Воскресенского и [и др]. М.: Институт Европы РАН, ТЦ Юнеско, 2009.
8. Krukowski J. Polskie prawo wyznaniowe. Warszawa, 2000.
9. Pietrzak M. Prawo wyznaniowe. Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN, 1995.


УДК 94(476)(301)

## СЯЛЯНСКАЕ ПАЎСТАННЕ Ў ДЗІСНЕНСКІМ І БРАСЛАЎСКІМ ПАВЕТАХ У ЧЭРВЕНІ 1919 г.: НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ Ў АНАЛІЗЕ САЦЫЯЛЬНАГА КАНФЛІКТУ


***А. І. Лізуноў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, lizunov_97@list.ru*



У артыкуле разглядаюцца падзеі сялянскага паўстання ў Дзісненскім і Браслаўскім паветах у чэрвені 1919 г. Магчымасць і вынікі выкарыстоўвання новых падыходаў у аналізе сацыяльнага канфлікту, такіх як: інтэгратыўны падыход, маркаўскі ланцуг.



***Ключавыя словы:*** *паўстанне; Дзісненскі павет; Браслаўскі павет; інтэгратыўны падыход; маркаўскі ланцуг.*


## КРЕСТЬЯНСКОЕ ВОССТАНИЕ В ДИСНЕНСКОМ И БРАСЛАВСКОМ ПОВЕТАХ В ИЮНЕ 1919 г.: НОВЫЕ ПОДХОДЫ В АНАЛИЗЕ СОЦИАЛЬНОГО КОНФЛИКТА


***А. И. Лизунов***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, lizunov_97@list.ru*



В статье рассматриваются события крестьянского восстания в Disненском и Браславском уездах в июне 1919 г. Возможность и результаты использования новых подходов в анализе социального конфликта, таких как: интегративный подход, Марковская цепь.



***Ключевые слова:*** *восстание; Дисненский повет; Браславский повет; интегративный подход; марковская цепь.*

# THE PEASENT UPRISING IN DISNA AND BRASLAV REGION IN THE JUNE 1919: NEW APPROACHES IN THE ANALYSISOF SOCIAL CONFLICTS

***A. I.Lizunov***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus lizunov_97@list.ru*

The article discusses the events of the peasant uprising in Disney and Braslav counties in June 1919. The possibility and results of using new approaches in the analysis of social conflict, such as: integrative approach, Markovsky chain.

***Key words:*** *uprising; Disna county; Braslav county; integrative approach; Markovsky chain.*

Перыяд 1917–1921 гг., XX ст. мелі для Беларусі лёсавызначальны сэнс. У дадзены перыяд на тэрыторыі Беларусі адбываліся падзеі, якія маглі змяніць лёс дзяржаўнасці на падставе разнастайных палітычных ідэялагем. Як вядома, у гэтым змаганні за ўладу на тэрыторыі Беларусі, перамаглі бальшавіцкія сілы. Вядомы яскравыя спробы беларускага нацыянальнага руху даць адпор, гэта і абвешчанне Беларускай Народнай Рэспублікі, і Слуцкі Збройны Чын, і выступ генерала С.Булак-Балаховіча. Але акрамя такіх вядомых падзеяў таксама адбываліся хваляванні ў вёсках і сялянскія паўстанні. Адным з такіх паўстаннеў адбылося ў Дзісненскім і Браслаўскіх паветах у чэрвені 1919 г.

Прычыны паўстання называюцца згодна дакументам наступныя. У Дзісненскім павеце, як і Браслаўскім вялікае свавольніцтва меў мясцовы Вайсковы аддзел. Фактычна Вайсковыя аддзелы панавалі над астатнімі і прымушалі выконваць захады дзеля задавальнення сваіх мэтаў не зважаючы на настроі і патрэбы мясцовага насельніцтва. У выніку стаўленне насельніцтва змяняліся хутка і ў неспрыяльным ключы для савецкай улады. Сваім галоўным ворагам сялянства пачало лічыць камуністаў. Але ў той жа час сялянства выказвалася аб тым, што бальшавікі гэта ахоўнікі сялянства, якія нічог благога наконт сялянства не робяць. Асаблівую незадаволенасць сялянства двух паветаў выказвала наконт палітыкі Вайсковага камунізма і харчразвёрсткі. Таксама адзначаліся моцныя антысяміцкія настроі і агітацыйная праца з насельніцтвам з боку прадстаўнікоў партыі левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў [1, с. 77–79].

Такім чынам можна казаць аб нарастанні супярэчнасцяў, якія выліліся ў выбухнуўшае паўстанне. Само вырашэнне дадзенага сацыяльнага канфлікту было дыструктыўным, бо тыя супярэчнасці, якія назапасіліся ў дадзеных паветах не атрымалі спроб для вырашэння. Але з іншага боку вырашыць асноўныя супярэчнасці, якія былі выкліканы з боку правадзімай палітыкі Вайсковага камунізму вырашыць на карысць сялянства было немагчыма. Але пытанні свавольніцтва мясцовай улады вырашаны не былі ў адрозненні ад іншых паветаў Беларусі.

Само паўстанне распачалося 14 чэрвеня 1919 г. у вёсцы Германовічы Дзісненскага павету. Асноўнымі прычынамі, як сведчаць дакументы Савету Абароны Літвы і Беларусі, была незадаволенасць сялянствам тымі захадамі, якія прымала савецкая ўлада адносна сялянства, асаблівую незадаволенасць сыходзіла ад харчразвёсткі. Іншым пытаннем было тое, што сялянства масава не мела даверу да камуністаў, але, як не дзіўна, цалкам давярала бальшавікам. Аб гэтым сведчаць і лозунгі з якімі адбылося паўстанне: “За саветы без камуністаў”, “Смерць камуністам”, “Далоў Савет”. Пры гэтым паўстаўшыя ніяк не выказваліся супраць бальшавікоў. Варта заўважыць, што дадзены недавер быў не толькі ў гэтым выпадку, але як сведчаць дакументы Савету дадзеная сітуацыя адбывалася ва ўсіх паветах Беларусі, якія былі заняты бальшавікамі. Як вынік можна казаць аб кволым палітычным уяўленні навакольных падзеяў [1, с. 61, 66].

Такім чынам можна казаць, што незадаволенасць з боку сялянства, якая назапасілася з боку сялянства за месяцы з моманту ўсталявання савецкай улады ў абодвух паветах, наклалася на канкрэтныя падзеі харчразвёрсткі. У выніку склалася спрыяльная сітуацыя для разгортвання стыхійнага паўстання сялян супраць савецкай улады.

Адна з галоўных мэтаў паўстаўшых была накіравана на тое, каб выйсці ў район Глыбокага, разгарнуць паўстанне на як мага большы абшар, прарваць лінію савецка-польскага фронту і перайсці да польскага боку. З указанай мэты паўстання можна зрабіць вынік, што паўстаўшыя прагнулі запаліць паўстання ў суседніх паветах. Гэта сведчыць аб тым, што такія праявы свавольніцтва з боку савецкіх органаў і ўстаноў былі масавымі, што дала падставу паўстаўшым зрабіць спробу пашырыць паўстанне. З-за тога, што дакументы Савету Абароны Літвы і Беларусі, адлюстроўваюць актыўную

дзейнасць прадстаўнікоў партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, то прагненне паўстанцаў перайсці на польскі бок можна патлумачыць наступным чынам. Беларускія эсэры не вызнавалі беларускую дзяржаўнасць на пазіцыях Літоўска-Беларускай ССР і перайсці на нелегальны стан. Але адначасова Эсэры падтрымлівалі добрыя адносіны з кіраўніцтвам Польскай сацыялістычнай партыі, таму прагненне да аб'яднання з польскімі войскамі, можна тлумачыць як спробы аб'яднання [1, с. 54].

Самі гэтыя мэта, далі падставу савецкім органам называць кіраўніцтва паўстання польскімі легіянерамі-белагвардзейцамі, а падтрымаўшых іх сялян – зялёнымі, таму ў савецкія дакументы дадзенае паўстанне ўвайшло як Бела-зялёнае. Менавіта такая тэрміналогія як польскія легіянеры тлумачыцца прагненнем паўстаўшых да пераходу на польскі бок [1, с. 69].

Само паўстанне адбывалася наступным чынам. Групоўка паўстанцаў налічвала 3000 асоб за ўвесь час паўстання. Немагчыма дакладна назваць колькасць паўстаўшых на розных этапах, бо на бок паўстання пераходзілі цэлыя роты чырвонаармейцаў. Першыя сутыкненні паміж паўстаўшымі і аддзеламі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Армія прынеслі перамогі і папаўненні [1, с. 83-86].

Першымі на сустрач руху паўсташых у накірунку Глыбокага былі кінутыя Дзвінская, Браслаўская роты і Глыбоцкая конная рота. Дзвінская і Глыбоцкая роты цалкам са зброяй перайшлі на бок паўстаўшых. Першы сур'ёзны бой, які адбыўся 20 чэрвеня не дала якога-небудзь дакладнага выніку. Браслаўская рота, якаў уступіла ў бой 21 чэрвеня супраць аддзелаў паўстаўшых была на палову разбіта, а рэшткі Браслаўскай роты перайшлі на бок паўстанцаў.

Дадзеныя падзеі вымусілі бальшавіцкія ўлады зканцэнтраваць супраць паўстаўшых значныя сілы. Былі сцягнутыя вайсковыя аддзелы РСЧА з Віцебску, ад аперацыі супраць паўстаўшых былі адхіленыя аддзелы РСЧА, якія былі сфармаваныя з мясцовых жыхароў. Аперацыя супраць паўстанцаў распачалася на прыканцы 20-х чэрвеня 1919 г. Паўстанцы былі адкінутыя ад Глыбокага і разсеяныя. З 27 па 30 чэрвеня адбываліся стыхійныя баі паміж паўстаўшымі і РСЧА. Па выніках гэтых баёў разрозненныя аддзелы паўстанцаў былі цалкам разбітыя.Згодна рапартам чырвоных камандзіраў ужо з 1 ліпеня 1919 г. паўстанцкай актыўнасці ні ў Дзісненскім, ні ў Браслаўскім паветах ужо не было [2, с.312]

Вынікам дадзенага паўстання былі наступныя падзеі. Пасля сканчэння актыўных вайсковых дзеянняў, на тэрыторыі паветаў агітацыйная дзейнасць з боку беларускіх эсэраў была спыненая. У цэнтры паўстання вёсцы Германовічы былі расквартэраваны аддзелы РСЧА, тым больш што нягледзячы на падаўленне паўстання рухалася лінія савецка-польскага фронту. Былі зняты з пасад кіраўнікі савецкіх органаў на месцах у Дзісненскім і Браслаўскім паветах. Такім чынам, можна казаць, што адзінай stationоўчай зменай у паўстанні была змена кіруючых асоб у паветах, але палітыка Вайсковага Камунізма і харчразвёрстак не спынілася.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 664. Воп. 1. Спр. 1.
2. Стужынская Н.І. Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву ў 20-я гг. XX стагоддзя. Мінск: Вараксін А.М. 2012.


УДК 930.2(476):[323.269.2(476)"1863/1864"+94(476)"1863/1864"]

# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ І ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

***Д. Ч. Матвейчык***

*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, вул. Крапоткіна, 55, 220002, г. Мінск, Беларусь, macviej@mail.ru*

На падставе некалькіх соцень публікацый аналізуюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця даследаванняў паўстання 1863–1864 гг., праведзеных беларускімі гісторыкамі. Вызначаюцца такія асноўныя тэндэнцыі, характэрныя для сучаснага этапу, як значная актыўнасць даследаванняў і істотнае расшырэнне кола праблем, пытанняў ці аспектаў. З іншага боку адзначаецца наяўнасць некалькіх важных праблем, якія маюцца ў развіцці гістарыяграфіі, – вялікі ўплыў пазанавуковых фактараў, празмерная канцэнтрацыя ўвагі на К. Каліноўскім, нізкая якасць правядзення даследаванняў і няўжытасць шматлікіх крыніц і іх комплексаў.